*УДК 94(476)«1941/45»*

# ЛИСТОВКИ И ВОЗЗВАНИЯ ЦК КП(Б)Б К СОВЕТСКИМ ГРАЖДАНАМ НА ОККУПИРОВАННОЙ ГЕРМАНИЕЙ ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ

***Э. МИРОНОВИЧ***[1)]

[1)]*Институт истории и политических наук Белостокского университета, пл. Независимого объединения студентов, 1, 15-420, г. Белосток, Польша*

Советская пропаганда в Беларуси полностью контролировалась Центральным комитетом Коммунистической партии (большевиков) Беларуси. Выявлено, что на начальном этапе Великой Отечественной войны она должна была дать однозначный ответ на вопросы о том, кто такие немцы, что для жителей СССР представляет собой война и какую позицию должен занять каждый советский гражданин. Пропаганда определяла оккупантов как убийц, кровожадных извергов и чудовищ, целью которых было уничтожение, обращение в рабство и грабеж советского народа. Утверждалось, что война идет за биологическое выживание белорусского народа, а единственным способом для выживания является уничтожение врага. Выполнить свой долг перед народом и Родиной предлагалось с оружием в руках в партизанских отрядах либо же посредством оказания помощи партизанам. Выделено еще одно направление пропаганды – призыв не делать того, что потенциально может усилить немцев: уклоняться от вывоза на принудительные работы в Германию, не выполнять обязательные поставки продуктов питания, а главное – не служить в парамилитарных коллаборационистских структурах. Анализ листовок и воззваний показал, что большинство их было написано по-белорусски.

***Ключевые слова:*** Вторая мировая война; Беларусь; немецкая оккупация; советская пропаганда.

# ЛІСТОЎКІ І АДОЗВЫ КП(Б)Б ДА САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН НА АКУПАВАНАЙ ГЕРМАНІЯЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

***Э. МІРАНОВІЧ***[1*]

[1*]*Інстытут гісторыі і палітычных навук Беластоцкага ўніверсітэта, пл. Незалежнага згуртавання студэнтаў, 1, 15-420, г. Беласток, Польшча*

Савецкая прапаганда ў Беларусі цалкам кантралявалася Цэнтральным камітэтам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Выяўлена, што на пачатковым этапе Вялікай Айчыннай вайны яна павінна была даць адназначны адказ на пытанні аб тым, хто такія немцы, што ўяўляе сабою вайна для жыхароў СССР, якую пазіцыю павінен заняць кожны савецкі грамадзянін. Прапаганда вызначала акупантаў як забойцаў, крыважэрных вылюдкаў і пачвар, мэты якіх – угон у няволю і рабаванне савецкіх народаў. Таму людзі былі ўпэўнены, што вайна ідзе за біялагічнае выжыванне беларускага народа. Адзіным шанцам на тое, каб выжыць, было вынішчэнне ворагаў. Галоўным спосабам выканаць свой абавязак у дачыненні да народа і Айчыны прадстаўлялася ўзброеная барацьба ў партызанскіх атрадах або аказанне дапамогі партызанам. Вылучаны яшчэ адзін напрамак прапаганды – заклік не рабіць таго, што патэнцыйна магло б узмацніць немцаў: не выязджаць на прымусовую працу ў Германію, не выконваць абавязковыя пастаўкі прадуктаў харчавання, а галоўнае – не служыць у парамілітарных калабарацыянісцкіх структурах. Такім чынам, мэтамі даследавання з’яўляюцца аналіз зместу лістовак і адозваў, выяўленне напрамкаў і вывучэнне паслядоўнасці прапагандысцкай працы. Аналіз лістовак і адозваў паказаў, што большасць з іх была надрукавана па-беларуску.

***Ключавыя словы:*** Другая сусветная вайна; Беларусь; нямецкая акупацыя; савецкая прапаганда.

**Образец цитирования:**
Міранові Э. Лістоўкі і адозвы КП(б)Б да савецкіх грамадзян на акупаванай Германіяй тэрыторыі Беларусі. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2019;4:27–35.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2019-4-27-35.

**For citation:**
Mironowicz E. Leaflets and appeals of the central committee of the Communist Party (Bolsheviks) of Belarus to the Soviet citizens in German-occupied Belarus. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2019;4:27–35. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2019-4-27-35.

**Автор:**
***Эугениуш Миронович*** – доктор исторических наук, профессор; заведующий кафедрой международной политики.

**Author:**
***Eugeniusz Mironowicz***, doctor of science (history), full professor; head of the department of international politics.
*ebma@interia.pl*
*https://orcid.org/0000-0001-5317-8695*

# LEAFLETS AND APPEALS OF THE CENTRAL COMMITTEE OF THE COMMUNIST PARTY (BOLSHEVIKS) OF BELARUS TO THE SOVIET CITIZENS IN GERMAN-OCCUPIED BELARUS

*E. MIRONOWICZ*[a]

[a]*Institute of History and Political Science, University of Bialystok,*
*1 Niezależnego Zrzeszenia Studentów Square, Białystok 15-420, Poland*

The analysis of the content of the appeal leaflets was to show what the Soviet leadership set for the people responsible for propaganda. The image of the enemy presented to the Belarusian society convinced them to uncompromising fight. The propaganda also left no doubt that any work strengthening the occupants' potential was a betrayal of the Soviet homeland. It reminded that the loyalty of the inhabitants of occupied Belarus should be shown only to the Soviet authorities. The one more goal of the research was to show the effects of propaganda work. They were clearly visible. This was manifested by a powerful guerrilla movement on the territory of the republic and a small, compared to neighboring republics Lithuania and Ukraine, implementation of imposed standards for the supply of labor to Germany and food contingents.

***Keywords:*** World War II; Belarus; German occupation; Soviet propaganda.

## Уводзіны

Прапаганда з'яўлялася часткай вайны гітлераўскага і сталінскага рэжымаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. На тэрыторыі акупіраванай Германіяй Беларусі і савецкі, і нямецкі бакі выкарыстоўвалі ўсе сродкі прапаганды для мабілізацыі ці запалохвання грамадства. Лістоўкі і адозвы, якія ствараліся ва ўмовах канспірацыі ці друкаваліся ў падпольных тыпаграфіях, першапачаткова агітавалі савецкіх грамадзян бароцца з акупантамі, а пачынаючы з 1943 г. запэўнівалі насельніцтва ў непазбежным вяртанні камуністычнай сістэмы і абавязковым высвятленні таго, якім чынам кожны з тых, хто апынуўся пад нямецкай акупацыяй, выканаў свой абавязак перад савецкай Радзімай.

## Вынікі і іх абмеркаванне

Надрукаваныя пераважна на аркушах невялікага памеру, лістоўкі і адозвы выступалі асноўным сродкам кантакту паміж савецкай уладай і грамадзянамі, якія апынуліся пад нямецкай акупацыяй. Фактычна яны выконвалі ролю падпольнай прэсы. Як вынікае з загалоўкаў лістовак, яны ствараліся для пэўных груп насельніцтва. Адрасатамі былі партызаны, радавыя савецкія грамадзяне, а таксама беларусы і прадстаўнікі іншых народаў СССР, якія праз нясенне службы ў паліцыі ці адміністрацыі падтрымлівалі акупантаў[1][1].

У ліпені – жніўні 1941 г. ЦК КП(б)Б выдаў 10 адозваў да «працоўнага люду», «працоўных і калгаснікаў», «жанчын» з заклікам ствараць партызанскія атрады, «знішчаць жывую сілу і тэхніку ворага», «пасіляць барацьбу за вызваленне Беларусі», «не аддаваць акупантам збожжа і прадукты харчавання» [1, с. 15–28]. Практычна ва ўсіх лістоўках, выдадзеных ЦК КП(б)Б у 1941 г., змяшчаўся заклік да барацьбы з акупацыйным рэжымам і дзейнасці па аслабленні нямецкага ваеннага патэнцыялу. У 1942 г. з'явіліся адозвы, якія мелі форму інструкцыі, якім чынам савецкія грамадзяне павінны паводзіць сябе ва ўмовах панавання ворага, а таксама адозвы, якія ўступалі ў палеміку з нямецкай прапагандай. У большасці лістовак меўся падзагаловак: «Смерць нямецкім акупантам!» – і парада, як далей карыстацца выданнем: «Прачытаў – перадай другому»[2].

Лістоўкі, якія выдаваліся абласнымі, гарадскімі і раённымі камітэтамі партыі, былі падобнымі да тых, якія выдаваліся Цэнтральным камітэтам. Сутнасць адозвы ніжэйшага партыйнага ўзроўню была ідэнтычнай, аднак у іх выкарыстоўваліся лозунгі, якія гучалі крыху інакш. Толькі нязначная частка лістовак, якія выдаваліся райкамамі, змяшчала ўдакладненні да лістовак, выдадзеных кіраўніцтвам партыі [1, с. 103–349].

Найбольш радыкальна гучалі лістоўкі Цэнтральнага камітэта Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі (ЛКСМБ). Моладзевая арганізацыя КП(б)Б менш клапацілася пра праўдзівасць зместу, стварала міфы аб гераізме маладых партызан, не ўлічвала рэальную сітуацыю [1, с. 351–447].

Кіраўніцтва КП(б)Б у 1942 г. звярнула ўвагу на вываз маладых людзей на прымусовую працу ў Германію. Было зразумела, што вывезеныя гра-

[1]Большасць адозваў і лістовак, якія распаўсюджваліся ў Беларусі, былі выдадзены ў 1952 г. у зборніку, падрыхтаваным Інстытутам гісторыі партыі ЦК КП(б)Б. Некалькі соцень дакументаў, якія не прадстаўлены ў гэтым зборніку, знаходзяцца ў Музеі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь.

[2]Браты беларусы! Не пападайцеся ў нямецкую лавушку! [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?-path=/catalogue/view-445&menu_id=289 (дата звароту: 06.03.2019).

мадзяне ўзмацняць эканамічны патэнцыял Германіі, і больш таго, пакідаючы тэрыторыю Беларусі, гэтыя людзі выйдуць з-пад кантролю савецкай улады. Адозва ЦК КП(б)Б да беларусаў пад назвай «Браты беларусы! Не пападайцеся ў нямецкую лавушку!» (1942) заклікала пазбягаць выезду на прымусовую працу ў Германію. «Помніце, хто едзе працаваць на нямецкія прадпрыемствы, паднімае руку супроць свайго народа. Ён едзе рабіць зброю, якой немцы збіраюцца разбураць нашы гарады і вёскі, забіваць бацькоў, братоў, сясцёр і дзяцей беларусаў, рускіх, украінцаў. Помніце – хто едзе ў Германію, таго чакае немінучая смерць. Фашысты хочуць знайсці для сябе не толькі дзяшовую, а нават дармавую рабочую сілу. Яны ставяць сваёй задачай зрабіць беларусаў, украінцаў, рускіх і другія славянскія народы рабамі нямецкіх паноў і баронаў»[3] (тут і далей цытаты прыводзяцца з захаваннем арфаграфіі і пунктуацыі арыгінала. – *Э. М.*). Партыйныя ўлады давалі зразумець, што выезд на прымусовую працу ў Германію раўназначны здрадзе дзяржаве і народу. Пасля вайны менавіта так кваліфікавалі паднявольных рабочых, якія вярталіся з Германіі. Змест лістоўкі пераконваў беларусаў, што яны будуць працаваць да знясілення, таму што ў Германіі пануе голад, а прадуктаў харчавання не хапае нават немцам. Славянскія рабы, як пісалася ў лістоўцы, былі асуджаны калі не на галодную смерць, то на смерць ад бомб саюзнікаў. Англічане фактычна штодзень бамбяць нямецкія прамысловыя прадпрыемствы, а пад іх заваламі паміраюць пераважна паднявольныя рабочыя.

Лістоўка ЦК КП(б)Б пад назвай «Гітлер – вызваліцель» уяўляла сабой палеміку з нямецкай прапагандай пра вызваленчую місію вермахта ва Усходняй Еўропе. Фашысцкія плакаты сцвярджалі, што немцы з'явіліся для таго, каб вызваліць беларусаў з-пад бальшавіцка-яўрэйскага прыгнёту. Вышэйшы орган партыі беларускіх камуністаў запэўніваў: «Гітлер – сусветны забойца, вешальнік, пагромшчык. І, каб абяліць перад народам свайго крывавага вар'ята, фашысцкія пустабрэхі спрабуюць давесці, што Гітлер, моў, прынёс беларускаму народу вызваленне. Ад чаго ж вызваліў Гітлер беларускі народ? Што за вызваліцель Гітлер?

Гітлер – вызваліцель ад вольнасці. Гэты крывавы забойца і разбойнік зняволіў беларускі народ, пазбавіў яго нацыянальнай самастойнасці і дзяржаўнасці. Катаржную працу на немцаў, прымусовы вываз беларускіх людзей на нявольніцкія работы ў Германію, вісельніцы і засценкі гестапа – вось што даў Гітлер замест свабоды»[4].

Далей аўтары пісалі пра тое, як Гітлер «вызваліў» беларусаў ад хлеба і зямлі. ЦК КП(б)Б інфармаваў жыхароў акупаванай краіны, што з моманту, калі «галодныя і вашывыя гітлераўскія банды»[5] ўварваліся ў Беларусь, яны рабуюць ўсё: збожжа, жывёлу, птушак. Беларусаў пазбавілі прадуктаў харчавання. У Віцебску, Мінску і Гомелі сотні людзей паміраюць ад голаду кожны дзень. У лістоўцы сцвярджалі, што Германія вядзе вайну, каб авалодаць беларускімі, украінскімі і расійскімі землямі і надзяліць імі нямецкіх памешчыкаў і баронаў.

Змест лістоўкі складаў выразны антытэзіс нямецкай прапаганды аб вызваленні, цывілізацыйнай місіі і Еўропе вольных народаў, у якой з дазволу Гітлера беларусы зоймуць пачэснае месца.

Абвяргала пастулаты нямецкай прапаганды і лістоўка 1942 г. пад назвай «Вялікі рускі народ – друг беларускага народа». ЦК КП(б)Б, выкарыстоўваючы ваенную рыторыку, заявіў, што нямецкая прапаганда шмат увагі і сіл надае таму, каб упэўніць народ, што «немец – друг беларуса, а рускі – вораг»[6] [4]. У сувязі з гэтым грамадзянам Беларусі тлумачылі, што спачатку Германія хоча раз'яднаць славян, каб далей было прасцей зрабіць іх сваімі рабамі, таму што са згуртаванымі славянскімі народамі «немцам ніяк не справіцца»[7]. Прыгадвалася бітва пад Грунвальдам, дзе «аб'еднаныя сілы палякаў, беларусаў і рускіх»[8] змаглі стрымаць нямецкую агрэсію, а таксама падзеі 1918 г., калі «рускія, беларусы і ўкраінцы аб'еднанымі сіламі выгналі нямецкіх захопнікаў з сваёй роднай зямлі»[9]. Пра ўдзел літоўцаў у бітве пад Грунвальдам не згадвалася, паколькі сучасныя літоўцы масава супрацоўнічалі з Германіяй. Прыклад 1918 г. не меў нічога агульнага з рэчаіснасцю, аднак для прапаганды гэта не мела значэння.

На адваротным баку лістоўкі ЦК КП(б)Б у форме лозунгаў звяртаўся да «Братоў беларусаў» (лозунг надрукаваны прапіснымі літарамі): «Дык адпомсцім-жа праклятым захопнікам за ўсе іх злачынствы!»; «Да зброі, браты-беларусы! Біце ненавіснага немца ўсюды, дзе яны ёсць. Немец прыйшоў да нас грабіць, не чакай ад немца дабра, воўк – не пастух, а свіння – не агародніца»[10].

[3]Браты беларусы! Не пападайцеся ў нямецкую лавушку! [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?-path=/catalogue/view-445&menu_id=289 (дата звароту: 06.03.2019).

[4]«Гітлер – вызваліцель» [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-454&menu_id=298 (дата звароту: 06.03.2019).

[5]Там жа.

[6]Вялікі рускі народ – друг беларускага народа [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-452&menu_id=296 (дата звароту: 06.03.2019).

[7]Там жа.

[8]Там жа.

[9]Там жа.

[10]Там жа.

У лістоўцы ЦК КП(б)Б «Да рабочых часова акупіраваных гарадоў Беларусі» (1942), акрамя сцвярджання аб хуткай перамозе Чырвонай арміі, змяшчаўся заклік ісці шляхам французскіх працоўных. Чытачоў пераконвалі, што на прадпрыемствах акупіраванай Францыі часта псуецца абсталяванне, здараюцца аварыі і прастоі ў вытворчасці для нямецкай арміі. Заяўлялася, што ва ўсёй Еўропе сярод працоўных пануе нянавісць да гітлераўскіх бандытаў і прага помсты. Прапіснымі літарамі з выкарыстаннем падкрэслівання ў лістоўцы надрукавана: «На ўсходнім фронце гітлераўцы нясуць велізарныя страты. Руйнуюцца захопніцкія планы немцаў. Неабходна наблізіць пагібель ашалелых фашыстаў»[11].

«Дапамагайце партызанам, ахоўвайце іх ад здраднікаў» – так называлася лістоўка да насельніцтва Беларусі. У ёй партыйнае кіраўніцтва прыгадвала, што «абавязак кожнага чэснага чалавека дапамагаць партызанам усімі сродкамі»[12]. Далейшы тэкст уяўляе сабой фактычна інструкцыю. Абавязкам савецкага грамадзяніна быў збор інфармацыі аб перамяшчэнні нямецкіх войскаў і карных атрадаў, дзейнасці здраднікаў-паліцаяў, размяшчэнні нямецкіх вайсковых штабаў і перадача гэтай інфармацыі партызанам. Прапіснымі літарамі было напісана: «Выяўляйце склады з боепрыпасамі, гаручым, харчаваннем, месцазнаходжанне аэрадромаў, колькасць на іх самалётаў – аб усім адразу-ж паведамляйце партызанам»[13]. Жыхароў папярэджвалі, што немцы часта пераапранаюцца, каб выглядаць як мясцовае насельніцтва, і разам з паліцаямі выдаюць сябе за партызан. Яны нібы шукаюць, дзе можна схавацца. У лістоўцы настойліва раілі пазбягаць якіх-небудзь размоў з незнаёмцамі пра партызан.

Да партызан і партызанак была адрасавана лістоўка з цытатамі І. Сталіна, дзе вызначалася іерархія мэтаў партызанскай вайны. Прапіснымі літарамі было вылучана, што І. Сталін перш за ўсё заклікаў да знішчэння сродкаў сувязі і транспарту ворага. Далейшымі цэлямі нападу партызан павінны былі стаць нямецкія штабы і ваенная тэхніка. Партызанам і партызанкам тлумачылі, што «сувязь – тэлефонная, тэлеграфная, радыё – адыгрывае вялікую ролю ў боездольнасці арміі, у ажыццяўленні баявых аперацый, на ўзаемадзеянне вайсковых падраздзяленняў»[14].

На пачатку 1942 г., калі кіраўніцтва СССР чакала чарговага наступлення нямецкіх войск у маскоўскім напрамку, Беларусь разглядалі як транзітную зону, праз якую ішло забеспячэнне вермахта. У Маскве лічылі, што для абмежавання баявой здольнасці нямецкай арміі неабходна паралізаваць шляхі камунікацыі ў Беларусі. Улічваючы гэтыя планы, штаб П. Панамарэнкі выдаў у маі 1942 г. загад аб знішчэнні чыгуначных шляхоў і рухомага саставу на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Гэта задача была даведзена да партызан у форме лістоўкі, загаловак якой быў надрукаваны прапіснымі літарамі і адлюстроўваў намеры кіраўніцтва партыі: «Мацней ўдар па камунікацыях ворага! Знішчайце фашысцкую гадзіну ў дарозе, не прапускайце да фронту ніводнага эшалона!»[15]. Далей гаворка ішла пра тое, як мужна змагаюцца салдаты Чырвонай арміі з ворагам, які мае вялікую тэхнічную перавагу. Каб павялічыць шанцы на перамогу, партыя звярталася да партызан Беларусі: «Зараз, як ніколі, асабліва важны рашучыя ўдары па камунікацыях ворага. Войскі і танкі праціўніка прадстаўляюць сілу на полі боя, але, калі яны знаходзяцца ў эшалонах, яны безабаронны і могуць быць знішчаны невялікай групай партызан»[16] [1, с. 52]. Паводле беларускага гісторыка К. Казака, у Беларусі за гады акупацыі былі знішчаны 11 128 адзінак ваеннага чыгуначнага транспарту, 34 бронецягнікі, 18 700 ваенных машын, а на фронт не дайшлі 1355 танкаў [2, с. 120]. Найбольшая колькасць акцый была праведзена ў маі – верасні 1942 г. У афіцыйнай беларускай гістарыяграфіі ёсць даныя, што ў красавіку 1942 г. былі зафіксаваны 65 нападаў на чыгуначныя шляхі, праз месяц – 145, а ў ліпені – 304 [3, с. 267]. Канцэнтрацыя дыверсійных дзеянняў у Беларусі з ваеннага пункта гледжання аказалася, аднак, памылковай, таму што новае нямецкае наступленне адбылося на паўднёвым фронце. Самай буйной дыверсійнай акцыяй на тэрыторыі акупіраванай Беларусі стала знішчэнне на чыгуначнай станцыі Асіповічы ў ноч на 30 ліпеня 1943 г. цягніка з поўнымі цыстэрнамі паліва. Выбух магнітнай міны пад адной з іх прывёў да выбуху 31 цыстэрны, складаў з авіябомбамі і артылерыйскімі снарадамі, танкаў, якія знаходзіліся на станцыі [4, с. 249].

У пераважнай большасці лістовак апісваліся нямецкія зверствы. Гэта павінна было пераканаць жыхароў Беларусі ў тым, што няма ніякіх маральных абмежаванняў у забойстве немцаў.

У адной з лістовак за снежань 1942 г. паведамлялася, што ў Мінску эсэсаўцы арганізавалі аблаву

[11]Да рабочых часова акупіраваных гарадоў Беларусі [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-494&menu_id=339 (дата звароту: 08.03.2019).

[12]Дапамагайце партызанам, ахоўвайце іх ад здраднікаў [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-502&menu_id=344 (дата звароту: 08.03.2019).

[13]Там жа.

[14]Дарагія браты! Беларускія партызаны і партызанкі! [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-503&menu_id=345 (дата звароту: 09.03.2019).

[15]Мацней удар па камунікацыях ворага! Знішчайце фашысцкую гадзіну ў дарозе, не прапускайце да фронту ніводнага эшалона! [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-476&menu_id=320 (дата звароту: 11.03.2019).

[16]Там жа.

ў раёне чыгуначнага вакзала, дзе сярод руін дамоў знайшлі 100 бяздомных дзяцей-сірот, якіх потым расстралялі. На адваротным баку змяшчалася пытанне-зварот, надрукаванае прапіснымі літарамі: «Таварышы! Няўжо мы даруем праклятым людаедам? Няўжо мы спакойна будзем глядзець, як гэтыя вампіры смокчуць нашу кроў? Помсціце ненавісным катам за ўсе іх злачынствы! Забівайце немцаў!»[17] [1, с. 75].

Лістоўкі прапагандавалі патрыятычныя паводзіны на акупіраванай тэрыторыі. Па вядомых прычынах вышэйшую форму служэння савецкай айчыне дэманстравалі партызаны. У адной з лістовак ЦК ЛКСМБ змяшчалася пытанне-зварот да маладых беларусаў: «Ведаеш ты аб бясстрашным партызане Анатоліі К.? Прачытай і раскажы аб ім сваім таварышам»[18]. Змест лістоўкі распавядаў пра 20-гадовага калгасніка Анатолія, які не мог сцярпець уладу нямецкага пана ў калгасе і яго здзекі над калегамі і вясковымі дзяўчатамі. Ён уцёк да партызан і ад таго часу дзясяткі немцаў загінулі ад куль, выпушчаных Анатоліем. Ён адзін уступіў у бой з 60 немцамі і мясцовымі паліцаямі, якія рабавалі адну з вёсак, і забіў шмат фашыстаў.

Падобна да Анатолія К. узорам паводзін для маладых беларусаў быў камсамолец Міхаіл Сільніцкі. Загаловак лістоўкі ЦК ЛКСМБ (май 1942 г.) гучаў так: «Знішчайце немцаў так, як камсамолец Міхаіл Сільніцкі»[19]. У некалькіх сказах аўтары паведамлялі, што першапачаткова малады партызан кулямётнымі чэргамі стрымліваў шалёны націск немцаў. Горы нямецкіх трупаў сталі вынікам гэтай часткі бою. Калі скончыліся кулі, Сільніцкі страляў з нагана. Немцы спрабавалі ўзяць камсамольца ў палон, але той адбіваўся нажом і забіў трох ворагаў. У лістоўцы не напісалі, чым скончыўся бой для Міхаіла Сільніцкага, а інфармавалі, што савецкі ўрад прысвоіў яму званне Героя Савецкага Саюза. Далейшы змест лістоўскі быў зваротам да беларускай моладзі: «Маладыя сыны Беларусі! Будзьце такімі, як Герой Савецкага Саюза, беларускі партызан Міхаіл Сільніцкі. Няхай кожны беларускі юнак, кожная беларуская дзяўчына гэтак-жа знішчаюць нямецкіх нягоднікаў, як Міхаіл Сільніцкі. Хочаш жыць – забі немца! – так гавораць сёння патрыёты савецкай радзімы. Хочаш выратаваць сваю родную Беларусь, сваю маладосць, свае шчасце – задушы нямецкага гада! Бі штыком, гранатай бі, бі чым можаш, а забі!»[20] [1, с. 354–355]. Іншая лістоўка ЦК ЛКСМБ ад 28 верасня 1942 г. паведамляла пра маладога партызана Уладзіміра Курыленку, які атрымаў званне Герой Савецкага Саюза за забойства тысячы немцаў і падрыў пяці чыгуначных саставаў, якія ішлі для забеспячэння вермахта. «Калі я сёння забіў немца, – так, па словах аўтараў лістоўкі, гаварыў сваім таварышам У. Курыленка, – значыць, я не дарма пражыў дзень» [1, с. 380].

Заклікі да моладзі забіваць немцаў з’яўляліся вынікам цяжкага становішча Чырвонай арміі на фронце ў 1942 г. Верагодна, П. Панамарэнка і яго штаб ведалі, што паўтарэнне міфічных учынкаў Анатолія К., У. Курыленкі ці камсамольца Сільніцкага прывядзе да рэпрэсій і значна большай колькасці ахвяр сярод цывільнага насельніцтва Беларусі, чым сярод немцаў. Аднак пагроза была для існавання Савецкага Саюза. Жыццё яго грамадзян у той сітуацыі было другасным.

Татальны характар нямецка-савецкай вайны схіляў кіраўніцтва СССР да дзеянняў, якія б абмяжоўвалі ворагу доступ да прадуктаў харчавання і забеспячэння ў цэлым. Праз лістоўкі сялян заклікалі да байкоту абавязковых паставак прадуктаў харчавання для немцаў. «Не давайце хлеба гітлераўскім катам!» – чытаем у лістоўцы за лістапад 1942 г. «Фашысцкая сволач ужо разявіла рот на новы ўраджай. Немцы пачалі ў Беларусі нарыхтоўкі. Гэтыя “нарыхтоўкі” нічым не адрозніваюцца ад крадзяжу і рабавання»[21] [1, с. 59]. Такім чынам партыя дэманстравала клопат пра лёс сялян, якіх абкрадалі. За іх кошт, як адзначалася, Гітлер жадае карміць сваіх катаў, якія паляць вёскі і забіваюць беларускіх дзяцей.

У сваю чаргу, нацысцкая прапаганда пісала пра тое, як некалькі год таму бальшавікі адабралі ў сялян зямлю і фактычна прымусілі іх існаваць на мяжы галоднай смерці. Немцы, якія вызвалялі сялян з нявол сталінскіх камісараў, жадалі толькі ўдзячнасці ў выглядзе паставак харчавання для «вызваліцеляў» і працягу прадуктыўнай працы.

Савецкая прапаганда не менш інтэнсіўна агітавала ўхіляцца ад выезду на работу ў Германію. З гэтай мэтай выдавалі спецыяльныя лістоўкі пад загалоўкам «Не давайце крывавому Гітлеру вывазіць нашых людзей у Германію! Знішчайце фашысцкіх вярбоўшчыкаў!»[22] [1, с. 367]. У гэтай лістоўцы, выдадзенай у ліпені 1942 г. ЛКСМБ, апісваўся лёс

[17] У Мінску немцы расстралялі сто дзяцей-сірот [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-545&menu_id=384 (дата звароту: 13.03.2019).

[18] Малады беларус! Ведаеш ты аб бясстрашным партызане Анатоліі К.? Прачытай і раскажы аб ім сваім таварышам [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-474&menu_id=318 (дата звароту: 13.03.2019).

[19] Знішчайце немцаў так, як камсамолец Міхаіл Сільніцкі [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-448&menu_id=292 (дата звароту: 14.03.2019).

[20] Там жа.

[21] Не давайте хлеба гитлеровским палачам! [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-487&menu_id=332 (дата звароту: 14.03.2019).

[22] Не давайце крываваму Гітлеру вывазіць нашых людзей у Германію! Знішчайце фашысцкіх вярбоўшчыкаў! [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-491&menu_id=335 (дата звароту: 16.03.2019).

славянскіх нявольнікаў, якіх вывезлі ў Германію. Выказванні тыпу «людзі мруць як мухі»; «хто паедзе ў Германію, назад не вернецца, а загіне» схілялі маладых людзей шукаць выхад з такой сітуацыі. А выхад бачыўся ў тым, каб ісці да партызан.

Немцы недахоп рабочай сілы і прадуктаў харчавання, якія планавалася адпраўляць у Германію, ліквідавалі падчас пацыфікацыі раёнаў, дзе не маглі дабіцца выканання вызначаных норм і павіннасцей.

***Савецкая прапаганда аб беларускім нацыянальным руху.*** Прапагандысцкая машына ЦК КП(б)Б і падпарадкаваных яму структур працавала як супраць нямецкіх акупантаў, так і супраць беларускага нацыянальнага руху, які з усталяваннем нямецкага панавання ва Усходняй Еўропе звязваў надзеі на пабудову некамуністычнай беларускай дзяржавы. Адной са спроб стварэння цэнтра дзяржаўнай улады стала грамадская нацыянальная арганізацыя «Беларуская народная самапомач» (БНС). Яна з’явілася ў кастрычніку 1941 г. па ініцыятыве беларускіх дзеячаў, якія з 1939 г. супрацоўнічалі з Германіяй.

Напрыканцы 1941 г. рашэннем генеральнага камісара В. Кубэ БНС атрымала правa на арганізацыю школьнага навучання, стварэнне культурна-асветніцкіх устаноў, выпуск перыядычных выданняў. У студзені 1942 г. была створана Цэнтральная рада БНС у складзе 10 чалавек, якая, як планавалі нацыянальныя дзеячы, у будучым стане ўрадам Беларусі.

В. Кубэ 29 чэрвеня 1942 г. выдаў распараджэнне аб Свабодным корпусе беларускай самааховы[23]. Праз некалькі дзён з’явілася адозва БНС, падпісаная членамі Цэнтральнай рады, з заклікам да беларусаў уступаць у народнае войска. «Заклікаем усіх беларусаў, – пісалі ў адозве, – да стварэння Беларускай самааховы супраць узброеных бандаў, якія называюць сябе партызанамі, аднак адзінае што робяць – рабуюць. Служба ў Самаахове з’яўляецца пачэснай службай беларускаму народу»[24].

Вялікая арганізацыйная праца беларускіх дзеячаў была перакрэслена немцамі, якія не хацелі вырашэння беларускіх нацыянальных праблем нават у межах марыянеткавай дзяржавы. Мабілізаваным у беларускае войска сотням тысяч маладых мужчын яны прапанавалі службу ў паліцэйскіх батальёнах пад камандаваннем нямецкіх афіцэраў. БНС фармальна была распушчана ў красавіку 1943 г. Лёс гэтай арганізацыі падзялілі і ўдзельнікі Беларускага корпусу самааховы. Частка салдат была пераведзена на службу ў паліцыю, частку вывезлі на працу ў Германію, іншыя збеглі да партызан ці былі імі забіты [5, с. 320].

Стварэнне БНС стала сур’ёзным выклікам для савецкага падполля. За некалькі месяцаў да новага руху далучыліся дзясяткі тысяч беларусаў. Прапаганда Камуністычнай партыі ў лістоўках высунула найбольш цяжкія абвінавачанні ў адрас сваіх апанентаў з нацыянальнай і палітычнай сферы. «Што такое “Беларуская самапомач”?»[25] – задаваліся пытаннем у загалоўку лістоўкі. І ніжэй адказвалі: «Гітлераўскія гады снуюць на беларускай зямлі агіднае шпіёнскае павуцінне, каб заблытаць у яго наш народ. Пад шыльдай здрадніцкай “Беларускай самапомачы” яны хочуць насадзіць на Беларусі свой бандыцкі “новы парадак”[26]. І прапіснымі літарамі дадавалася: «Кожны беларус павінен ведаці, што “Самапомач” – гэта нямецкая пятля на шыі народа»[27].

Факт удзелу дзясяткаў тысяч беларусаў у дзейнасці структур БНС савецкая прапаганда трактавала выключна як інструмент нямецкай прапаганды. Яна не згадвала ні нацыянальны рух, ні яго мэты. Людзі, якія былі звязаны з гэтым асяроддзем, успрымаліся як калабарацыяністы і здраднікі, якім партыя давала шанец пазбавіцца ад ганьбы за супрацоўніцтва з акупантамі. За подпісамі сакратара ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкі, старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Н. Наталевіча і старшыні Савета народных камісараў БССС І. Былінскага выйшла лістоўка, якая была адрасавана старастам, паліцаям, служачым адміністрацыі і ўсім тым, хто быў ашуканы немцамі або пачаў «з-за страху служыць ворагу»[28]. Кіраўнікі рэспублікі абяцалі памілаваць іх і іх сем’і пры ўмове, што здраднікі пачнуць «чэсна служыць совецкаму народу»[29].

У 1943 г. па распараджэнні Камуністычнай партыі да сваіх праціўнікаў падобным чынам стала звяртацца і кіраўніцтва партызанскіх атрадаў. Такі характар мела, напрыклад, лістоўка з прапановай камандавання мясцовага савецкага падполля да паліцаяў, якія неслі службу ў нямецкіх гарнізонах у Мозыры і Ельску. Камандзіры, імёны і прозвішчы якіх не былі пазначаны, прапагандавалі адрасатам перайсці, забраўшы зброю, на бок партызан і весці барацьбу супраць акупантаў. Савецкіх грамадзян, хто супрацоўнічаў з немцамі, пераконвалі ў хуткай перамозе Чырвонай арміі і непазбежным судзе за выкананне сваіх абавязкаў перад Айчы-

[23]Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 380. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 32.
[24]Там жа. Арк. 36.
[25]Што такое «Беларуская самапомач»? [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-707&menu_id=527 (дата звароту: 17.03.2019).
[26]Там жа.
[27]Там жа.
[28]Да старастаў, да паліцэйскіх, служачых гарадскіх упраў і камендатур, да ўсіх тых, хто абмануты нямецкімі захопнікамі, хто з-за страху служыць ворагу [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-497&menu_id=343 (дата звароту: 21.03.2019).
[29]Там жа.

най. Шанцам на выратаванне сябе і сваёй сям'і быў пераход на савецкі бок і барацьба за вызваленне Айчыны ў шэрагах партызанскіх атрадаў[30]. На адваротным баку лістоўкі была надрукавана песня, у якой ананімны аўтар прарочыў здраднікам кароткае жыццё ў чаканні «сабачай смерці»[31]. Паліцаям паказвалі безальтэрнатыўную будучыню, у якой адзіным шанцам выжыць была адданая служба на баку І. Сталіна.

Восенню 1943 г. сітуацыя на фронце вымусіла немцаў выкарыстаць патэнцыял беларускага нацыянальнага руху. Па часе гэта супала з пачаткам актывізацыі савецкага руху супраціўлення, што фактычна стварыла сітуацыю грамадзянскай вайны ў Беларусі.

У канцы 1943 г. немцы змянілі тактыку і з мэтай мабілізацыі сіл вырашылі стварыць фіктыўныя структуры беларускай улады. Новы генеральны камісар К. фон Готберг прыйшоў да рашэнняў, якім да гэтага, будучы камендантам СС, рашуча супраціўляўся. Галоўнай мэтай паўстання беларускай дзяржаўнай улады было стварэнне ўзброеных падраздзяленняў, якія б змагаліся з партызанамі, а пазней – і з Чырвонай арміяй. Фактычна гэта азначала аднаўленне ідэй кіраўнікоў БНС. Немцы рэалізоўвалі свой план, добра ўсведамляючы часовасць ствараемых структур і наступствы для беларусаў пасля ўваходу Чырвонай арміі на тэрыторыю Беларусі.

У апошнія снежаньскія дні 1943 г. К. фон Готберг заявіў аб намеры стварыць новы орган улады ў Беларусі – Беларускую цэнтральную раду (БЦР) на чале з Р. Астроўскім у якасці прэзідэнта. Нямецкая беларускамоўная прапаганда распаўсюджвала міф пра БЦР як пра ўладу, якая прадстаўляе беларускі народ.

Містыфікацыя з утварэннем беларускай улады давала прававы падмурак для стварэння ваенных фарміраванняў пад назвай Беларуская краёвая абарона (БКА). Такая мера павінна была даваць салдатам дадатковую матывацыю ў барацьбе з партызанамі. Прызваных на ваенную службу адпраўляла ў бой улада, якая выступала ад імя народа і краіны, а не акупанты, якія палілі вёскі і забівалі насельніцтва. Беларускія камандзіры, нацыянальныя сімвалы, беларуская мова ў загадах – гэта былі фактары, якія павінны былі адрозніваць службу ў новастворраным войску ад паліцэйскіх фарміраванняў, якімі камандавалі нямецкія афіцэры і малодшы камандны састаў.

Актывізацыя мабілізацыйнага руху на пачатку 1944 г. стала выклікам для савецкага падполля. У лістоўцы Шчучынскага раённага камітэта КП(б)Б «Прэч са злачыннай нямецкай мабілізацыяй» (сакавік 1944 г.) прызыў у беларускае войска апісваўся як рэалізацыя выключна нямецкага праекта: «Фашысцкія правадыры абвясцілі мабілізацыю беларускага насельніцтва ў Германскую армію. За кошт беларускіх мужчын і юнакоў нямецкія бандыты жадаюць папоўніць свае істотныя страты ў людской сіле і затрымаць магутнае наступленне Чырвонай арміі. Мабілізацыяй беларусаў гітлераўскія каты жадаюць у той самы момант забіць другога зайца – цалкам знішчыць цвет беларускага народа, кінуўшы яго ў вір братазабойчай вайны» (тут і далей пераклад наш. – *Э. М.*)[32]. Падобнага роду лістоўкі выходзілі і ў іншых раённых камітэтах партыі.

Мінскі камітэт КП(б)Б выдаў лістоўку пад назвай «Загад Прэзыдэнта Беларускай Цэнтральнай Рады» за подпісам Р. Астроўскага, фармат і графічнае афармленне якой былі падобны да тых, што распаўсюджвалі акупацыйныя ўлады[33]. Гэта была свайго роду маскіроўка, якая дазваляла хаця б на некальκі гадзін змясціць лістоўку ў грамадскіх месцах Мінска. У ёй адзначалася, што абвешчаная мабілізацыя мужчынскага насельніцтва быццам бы для абароны ад бандытаў насамрэч праводзіцца для абароны немцаў. «Працоўныя Мінска! Ведайце, што [абвешчаная Р. Астроўскім] мабілізацыя ёсць угон на фронт, дзе вас прымусяць ваяваць за крывавага Гітлера. <...> Памятайце, што мабілізацыя ёсць угон у нямецкую няволю. Мінчане! Ратуйце сваё жыццё, не прыходзьце на мабілізацыйныя пункты. Сыходзьце ў партызанскія атрады. Не дазволім нямецкім катам знішчыць новыя тысячы беларускага народа»[34].

Усім фарміраванням, якія былі звязаны з немцамі, была адрасавана лістоўка, падрыхтаваная рэдакцыяй газеты «Савецкі патрыёт». Яна, як і іншыя падпольныя выданні, была выданнем КП(б)Б. Лістоўка мела наступны падзагаловак: «Навошта вы забіваеце сваіх братоў, сясцёр, жонак, матак, дзяцей і бацькоў? Да салдат і афіцэраў "Беларускай краёвай абароны". Да салдат, афіцэраў брыгады Камінскага і літоўскіх частак»[35]. Гэта быў заклік да выкуплення сваёй віны ў дачыненні да савецкай Айчыны.

[30] Добровольцам-казакам і паліцейскім Мозырьского і Ельского гарнізонов [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-505&menu_id=347 (дата звароту: 22.03.2019).

[31] Там жа.

[32] Долой преступную немецкую мобилизацию! [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-508&menu_id=350 (дата звароту: 10.04.2019).

[33] Загад Прэзыдэнта Беларускай Цэнтральнай Рады [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-444&menu_id=288 (дата звароту: 19.04.2019).

[34] Там жа.

[35] Зачем вы убиваете своих братьев, сестер, жен, матерей, детей и отцов? К солдатам и офицерам Белорусской краевой обороны. К солдатам, офицерам бригады Каминского и литовских частей [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-446&menu_id=290 (дата звароту: 23.04.2019).

З канца 1943 г. такіх адозваў да савецкіх грамадзян, якія змагаліся на баку немцаў, было шмат. Да іх масавага з'яўлення падштурхнула вярбоўка Рускай народнай брыгады СС на чале з палкоўнікам У. Радзіонавым, якая пасля пераходу на бок партызан стала называцца І антыфашысцкая партызанская брыгада. Да тых, хто заставаўся на службе ў немцаў, партыя звярталася такім чынам: «Па загаду нямецкіх фашыстаў паліце вёскі, тысячамі забіваеце жанчын, дзяцей і старых, дапамагаеце немцам рабаваць сваю радзіму. Ваша барацьба супраць партызан ёсць злачынствам перад народам. У хуткім часе Чырвоная армія зноў абрушыць усю моц сваёй зброі супраць нямецкіх захопнікаў. Немцы не застануцца на гэтай зямлі. Вось чаму яны спрабуюць вашымі рукамі да падыходу частак Чырвонай арміі знішчыць усё жывое, а пры сваім адыходзе яны знішчаць таксама і вашы дамы.

Немцам ёсць куды ўцякаць, у іх ёсць іх радзіма – Германія, але куды пабяжыце вы? Слуцкі памешчык, халуй Астроўскі не мае радзімы і ніколі не меў яе. Па загадзе Гітлера ён гвалтоўна мабілізаваў вас і "Краёвую абарону" і зараз, не шкадуючы вашага жыцця, пад камандаваннем нямецкіх афіцэраў гоніць вас на верную смерць. Мы ведаем, што шмат хто з вас не жадае ваяваць супраць свайго народа, але вас запалохалі жорсткасцю партызан. Не верце нямецкай брахні. Тых, хто перайшоў на бок партызан і здаўся ў палон, не расстрэльваюць...»[36]. Аўтары гэтай лістоўкі пераконвалі сваіх чытачоў, што адзіным шанцам выжыць з'яўляецца барацьба ў шэрагах партызанскіх атрадаў супраць сваіх былых гаспадароў. Тысячы паліцаяў і салдат БКА, якія збеглі да партызан, з'яўляюцца сведчаннем таго, што заснаваная на рацыянальных аргументах прапаганда мела чакаемы вынік.

Адозвы, адрасаваныя маладым людзям, з заклікамі перайсці на іншы бок фронту падтрымлівалі лістоўкі, дзе гаварылася пра набліжэнне Чырвонай арміі да межаў Беларусі, змяшчалася інфармацыя пра чарговыя паражэнні Германіі і пра сотні тысяч нямецкіх салдат, якія траплялі ў палон[37]. Загалоўкі іншых лістовак інфармавалі пра хуткае паражэнне гітлераўскай Германіі, капітуляцыю Італіі і поспехі войск саюзнікаў на заходнім фронце[38]. У такой сітуацыі вельмі цяжка было матываваць прызваных на службу ў БКА да барацьбы за прайграную справу на баку саюзніка, які пацярпеў паражэнне.

## Высновы

Савецкая прапаганда ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны цалкам кантралявалася Цэнтральным камітэтам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. На пачатковым этапе вайны яна павінна была даць адназначны адказ на пытанні аб тым, хто такія немцы, што ўяўляе сабою вайна для жыхароў СССР і якую пазіцыю павінен заняць кожны савецкі грамадзянін. Прапаганда вызначала акупантаў як забойцаў, крыважэрных вылюдкаў і пачвар, мэтай якіх былі знішчэнне, угон у няволю і рабаванне савецкіх народаў, а таму ўпэўнівала, што вайна ідзе за біялагічнае выжыванне беларускага народа. У гэтых умовах прапаганда адзначала, што для таго, каб выжыць, неабходна арганізаваць масавае супраціўленне акупацыйным войскам. Рэалізаваць гэты намер планавалі з дапамогай узброенай барацьбы партызанскіх атрадаў. Тыя ж, хто не мог пайсці ў партызаны, павінны былі аказваць ім усялякую дапамогу.

Другім напрамкам прапаганды стаў заклік не рабіць нічога, што патэнцыйна магло даць перавагу немцам. ЦК КП(б)Б заклікаў не выязджаць на прымусовую працу ў Германію, не выконваць абавязковыя пастаўкі прадуктаў харчавання, а галоўнае – не падтрымліваць беларускія калабарацыянісцкія структуры, не служыць у іх параміліратных фарміраваннях. Пераважная большасць лістовак і адозваў ЦК КП(б)Б была надрукавана па-беларуску.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Гарбуноў ЦС, Новікава ФА, Кожар ІП, рэдактары. *Зборнік лістовак усенароднай партызанскай барацьбы ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1944 гг.)*. Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР; 1952. 545 с.
2. Козак К. Формы и состояние противостоящих сил в условиях германской оккупации Беларуси 1941–1944 гг. В: Козак К, Лiтвін А, Сідарцоў У, рэдактары. *Генацыд у Другой сусветнай вайне. Праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца)*. Мінск: БДУ; 2003. с. 116–132.
3. Коваленя А, редактор. *Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945*. Минск: Белорусское телеграфное агентство; 2005. 540 с.
4. Новік Я, Марцуль Г, рэдактары. *Гісторыя Беларусі. Частка 2*. Мінск: Вышэйшая школа; 1998. 464 с.
5. Шыбека З. *Нарыс гісторыіі Беларусі (1795–2002)*. Мінск: Энцыклапедыкс; 2003. 490 с.

[36]Зачем вы убиваете своих братьев, сестер, жен, матерей, детей и отцов? К солдатам и офицерам Белорусской краевой обороны. К солдатам, офицерам бригады Каминского и литовских частей [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-446&menu_id=290 (дата звароту: 23.04.2019).

[37]Чырвоная Армія наступае! [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-550&menu_id=389 (дата вароту: 12.05.2019).

[38]Близится крах гитлеровской Германии [Электронны рэсурс]. URL: http://old.nlb.by/vov70/index.php?path=/catalogue/view-443&menu_id=287 (дата звароту: 12.05.2019).

## References

1. Garbunow CS, Novikava FA, Kozhar IP, editors. *Zbornik listovak usenarodnaj partyzanskaj barac'by w Belarusi w gady Vjalikaj Ajchynnaj vajny (1941–1944 gg.)* [A collection of leaflets of guerrilla war in Belarus during the Great Patriotic War 1941–1944]. Minsk: Dzjarzhawnae vydavectva BSSR; 1952. 545 p. Belarusian.

2. Kozak K. [Forms and state of antagonistic forces in the condition of German occupation in Belarus in 1941–1944]. In: Kozak K, Litvin A, Sidarcow U, editors. *Genacyd u Drugoj susvetnaj vajne. Prablemy dasledavannja (u pamac' ahvjar Trascjanca)* [Genocide in the World War II. Problems of research (in memory of the victims of Trostenets)]. Minsk: Belarusian State University; 2003. p. 116–132. Russian.

3. Kovalenya A, editor. *Belarus' v gody Velikoi Otechestvennoi voiny 1941– 1945* [Belarus during the Great Patriotic War 1941–1945]. Minsk: Belarus Telegraph Agency; 2005. 540 p. Russian.

4. Novik Ja, Marcul' G, editors. *Gistoryja Belarusi. Chastka 2* [The history of Belarus. Part 2]. Minsk: Vyshjejshaja shkola; 1998. 464 p. Belarusian.

5. Shybeka Z. *Narys gistoryii Belarusi (1795–2002)* [An outline of the history of Belarus (1795–2002)]. Minsk: Jencyklapedyks; 2003. 490 p. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 11.07.2019.*
*Received by editorial board 11.07.2019.*